По традыцыі апошні нумар газеты ў першым семестры мы прысвячаем завочнаму факультэту. І сёння наш расказ аб працоўных буднях завочнікаў.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (799) Чацвер, 28 студзеня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

# ПРАЦА І ПЛЁН КАЛЕКТЫВУ

Кожны год са сцен універсітэта выходзіць вялікі атрад маладых спецыялістаў — нашы выпускнікі. Адны з іх у перыяд вучобы з дня у дзень слухалі універсітэцкіх лектараў, працавалі у лабараторыях, кабінетах, чытальных залах. Другія — завочнікі — валодалі універсітэцкімі багаццямі не толькі у кароткія тэрміны экзаменацыйных сесій і кансультацыйных дзён. Яны пастаянна карысталіся кніжным фондам бібліятэкі, метадычнай літаратурай, іх працу накіроўвалі і пільна сачылі за ёй вопытныя выкладчыкі. І не дзіўна, што большасць выхаванцаў завочнага факультэта карыстаецца славай выдатных спецыялістаў.

Ва універсітэце многае робіцца для удасканалення завочнага навучання. Галоўную увагу рэктарат, дэканат, кафедры сканцэнтроўваюць на паляпшэнні якасці навучання. Павышаецца навукова-тэарэтычны і ідэйна-палітычны узровень лекцый, семінарскіх і лабараторных заняткаў. Намаганні накіраваны на тое, каб у выкладанні шырока выкарыстоўвалася сувязь навукі з вытворчасцю, з практыкай камуністычнага будаўніцтва. На кафедрах, вучоных саветах факультэтаў сталі часцей абмяркоўвацца пытанні, звязаныя з арганізацыяй вучэбнага працэсу на завочным факультэце. Такія абмеркаванні адбыліся на філалагічным, матэматычным, юрыдычным, гістарычным, біялагічным, геаграфічным факультэтах і на факультэце журналістыкі.

На кафедрах часцей сталі абмяркоўваць тэксты лекцый, арганізоўваць адкрытыя лекцыі і семінарскія заняткі, складаць кантрольныя заданні і метадычныя дапаможнікі, праводзіць групавыя і індывідуальныя кансультацыі.

Вялікую вучэбна-метадычную работу на завочным факультэце праводзяць кафедры гісторыі КПСС, гісторыі СССР, агульнай хіміі, навуковага камунізма, рускай мовы, рускай класічнай літаратуры, эканамічнай геаграфіі СССР, эканамічнай геаграфіі зарубежных краін, гісторыі філасофіі і логікі, тэорыі і практыкі савецкага друку.

Такая пільная увага да завочнага навучання садзейнічала павышэнню паспяховасці, паглыбленню ведаў нашых студэнтаў. Больш на факультэце стала выдатнікаў. Сярод іх А. М. Абрамовіч, Б. О. Змітровіч — студэнты ІІІ курса юрыдычнага аддзялення, З. Д. Падоксік—студэнт V курса, І. І. Корсак—студэнт VI курса аддзялення гісторыі, студэнты VI курса аддзялення філасофіі Э. В. Сідараў, Н. Н. Белякові, М. Н. Антоненка і іншыя.

У мінулым навучальным годзе паспяхова прайшла абарона дыпломных работ. Большасць студэнтаў-завочнікаў паказала глыбокія і трывалыя веды на дзяржаўных экзаменах. Гэта істотныя поспехі. І усё ж яшчэ даводзіцца гаварыць аб недахопах. Пакуль мы не дабіліся такога становішча, каб усе студэнты своечасова і якасна выконвалі вучэбны план. Нямала студэнтаў-завочнікаў атрымліваюць на экзаменах нездавальняючыя адзнакі, маюць павярхоўныя веды.

Безадказна адносяцца да вучобы студэнты ІІ курса аддзялення гісторыі А. В. Булахаў, Р. Д. Гудзенка, Л. С. Дубінская, Е. В. Казлова, Н. М. Салей; студэнткі ІІ курса А. Н. Беразоўская, Т. І. Калеіна, ІІІ курса — Л. А. Мальцава, IV курса—В. Я. Тарасенка (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) і іншыя.

Па-ранейшаму значная частка завочнікаў выключаецца за непаспяховасць. У мінулым навучальным годзе па гэтай прычыне выключана 90 чалавек.

У сёлетнім годзе увесь калектыў універсітэта працуе над выкананнем сваіх абавязацельстваў у гонар XXIV з'езда КПСС і 50-годдзя БДУ. Сэнс іх у тым, каб зрабіць новы крок на шляху лепшай падрыхтоўкі усебакова адукаваных спецыялістаў, здольных рашаць важнейшыя сучасныя народнагаспадарчыя задачы. Наш доўг — і выкладчыкаў, і студэнтаў— унесці свой уклад у вырашэнне гэтай задачы. А гэта азначае: лепш, больш захоплена, эфектыўна працаваць і вучыцца.

Т. ДУДАРАВА,
дэкан завочнага факультэта.

# НА ПАРОЗЕ ВЫПУСКУ

*Сесія на стацыянары падышла к канцу, а у студэнтаў-завочнікаў яна толькі пачынаецца. Асабліва многа работы у выпускнікоў. Зімняя ж сесія у іх — апошняя, пасля—абарона дыпломных работ.*

*Наш карэспандэнт сустрэўся з некалькімі студэнтамі завочнага факультэта і папрасіў адказаць на наступныя пытанні:*

**1. Дзе вы жывяце, дзе працуеце?**

**2. Чаго дасягнулі дзякуючы вучобе? Як уплывае яна на вашу работу?**

**3. Найбольш памятныя падзеі універсітэцкіх гадоў?**

**4. Што больш за усё ускладняла вучобу?**

**5. Ці думаеце вы змяніць месца работы пасля заканчэння вучобы?**

*Ала МАСТОВІЧ, студэнтка VI курса біялагічнага факультэта:*

1. З нядаўняй пары я стала называць сябе мінчанкай: муж атрымаў назначэнне у Мінск, і мы пераехалі. А прыязджала на сесіі амаль на працягу усёй вучобы з Брэста. Цяпер працую хімікам-лабарантам у навукова-даследчым інстытуце мікрабіялогіі і вірусалогіі.

2. Перад паступленнем ва універсітэт працавала лабарантам на станцыі пералівання крыві. Пазней, пасля трэцяга курса, стала чытаць лекцыі па фізіялогіі чалавека у медыцынскім вучылішчы. Легка было у рабоце, таму што даводзілася многа пазнаваць самой пры падрыхтоўцы кантрольных работ. Мая ж вучоба мела прамыя адносіны да работы.

3. Што-небудзь асаблівае выдзеліць не магу. Проста радаснае пачуццё ахоплівае пасля паспяховай здачы кожнай сесіі.

4. Перш за усё сям'я. З ёю звязана многа клопатаў, многа турбот. Пасля работа, бо, акрамя прамых абавязкаў, ёсць яшчэ і грамадскія. Асабліва цяжка было на першым курсе. Усё здавалася незвычайным, не ведала, за што брацца. Але пасля прызвычаілася, нават дарогу з работы дадому разлічыла па мінутах, і усё пацякло у сваім рэчышчы. Канешне, з кожным курсам вучобе даводзілася удзяляць усё больш увагі: знаёмілася з новымі прадметамі, пазнавала усё больш цікавага.

5. Мне падабаецца медыцына, і не менш люблю біялогію. У любым выпадку веды не будуць перашкаджаць мне у будучай працы. А дзе іменна буду працаваць, пакуль не думала.

*Яўгеній НОВІКАЎ, студэнт VI курса геаграфічнага факультэта:*

1. Мне пашанцавала: я мінчанін і у перыяд паміж сесіямі маю магчымасць наведвацца ва універсітэт, калі гэта спатрэбіцца.

Я працую старшым інжынерам-геолагам у інстытуце па даследаванню і праектаванню дарог.

2. Пачынаў тэхнікам-геолагам. Цяпер — старшы інжынер.

Прадметы, якія вывучаў ва універсітэце, маюць да работы самыя непасрэдныя адносіны.

3. Запомніцца не падзея, а чалавек — загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі Іван Іванавіч Трухан. Добра адчуваеш сябе на яго лекцыях. За усе гады вучобы я не памятаю, каб ён пакінуў без увагі хоць аднаго завочніка. У Івана Іванавіча нейкі свой, асабісты падыход да людзей. А мне яшчэ давялося праходзіць практыку пад яго кіраўніцтвам. І я бачыў, як І. І. Трухан ніколі не шкадаваў асабіс-

(Працяг на 3-й стар).

# ДА ПАБАЧЭННЯ, СЯБРЫ!

*Я прыехаў у Мінск як былы студэнт падрыхтоўчага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, як былы прэзідэнт Зямляцтва студэнтаў з Камеруна, каб развітацца з універсітэтам, з выкладчыкамі, знаёмымі і сябрамі, таму што праз некалькі месяцаў, пасля заканчэння Адэскага мараходнага вучылішча рыбнай прамысловасці, я еду на радзіму.*

*Студэнты з Камеруна ніколі не забудуць тых клопатаў і дапамогі, якія былі аказаны нам кіраўніцтвам універсітэта і падрыхтоўчага факультэта, выкладчыкамі і супрацоўнікамі.*

*Гавораць, што сяброўства паміж дзяржавамі устанаўліваецца дагаворамі, паміж людзьмі — кветкамі. Я магу сказаць, што сяброўства паміж намі замацавана тымі ведамі, якія мы атрымалі ад выкладчыкаў вашых навучальных устаноў.*

*Галоўнае у жыцці — гэта прыносіць карысць людзям. І гэта галоўнае мы атрымалі у БДУ.*

*Прывітанне ўсім выкладчыкам, супрацоўнікам, студэнтам універсітэта і пажаданне, каб у жыцці усім спадарожнічалі шчасце і радасць. Дзякую за усё!*

*Думаю, што я з вамі сустрэўся не у апошні раз, бо руская пагаворка нездарма гаворыць, што гара з гарой не сыходзіцца, а чалавек з чалавекам сыйдзецца. І таму на развітанне я гавару: «Да пабачэння, дарагія савецкія сябры».*

*Бвамбі Бвамбі САМУЭЛЬ,*
*студэнт Федэратыўнай Рэспублікі Камерун.*



**НА ЗДЫМКУ (справа налева): Бвамбі Бвамбі Самуэль, яго зямляк студэнт ІІІ курса факультэта прыкладной матэматыкі БДУ Джоні Агого Ічамі і супрацоўнік падрыхтоўчага факультэта У. Г. Галайша ў час гутаркі.**

Фота Д. Прэса.

# СПЫНІЦЬ АГРЭСІЮ Ў ІНДАКІТАІ!

Надзвычай мнагалюдна было на сходзе Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру, прысвечаным міжнароднаму Дню салідарнасці з народамі Індакітая. На яго прыйшлі выкладчыкі і студэнты, прадстаўнікі грамадскасці Мінска.

З уступнай прамовай выступіў старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру пісьменнік І. П. Мележ. Прамоўца выказаў глыбокую заклапочанасць і трывогу беларускага народа становішчам, якое склалася у Індакітаі у сувязі з актывізацыяй дзеянняў амерыканскіх і іншых імперыялістаў.

Адзін за другім падымаюцца на трыбуну прамоўцы, каб заклеймiць ганьбай амерыканскіх агрэсараў і іх памагатых.

З гнеўным абурэннем жудаснымі злачынствамі амерыканскага імперыялізму, з патрабаваннем пакласці канец агрэсіі у Індакітаі выступаюць таксама дырэктар школы рабочай моладзі № 1 г. Мінска Герой Савецкага Саюза У. А. Парахневіч, выкладчык БДУ прафесар Л. І. Фігloўская, майстар вытворчага абутковага аб'яднання «Прамень» Герой Сацыялістычнай Працы С. Д. Гарачка, аспірант БДУ, прэзідэнт мінскага гарадскога зямляцтва в'етнамскіх студэнтаў Нгуен Куанг Мінь.

Удзельнікі сходу прынялі пастанову, у якой гнеўна асуджаюць грубае умяшанне амерыканскай ваеншчыны ва унутраныя справы Індакітая, патрабуюць спынення агрэсіі і вываду усіх замежных войск з яго тэрыторыі.

На сходзе былі таксама падведзены вынікі дзейнасці універсітэцкай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру. Было падкрэслена, што камісія шмат зрабіла па збору сродкаў.

Свой уклад у фонд міру унеслі каля 2000 выкладчыкаў, адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў, супрацоўнікаў выдавецтва, рабочых і служачых друкарні і вучэбнай гаспадаркі «Шчамысліца», а таксама большасць студэнтаў.

У заключэнне універсітэту былі ўручаны памятны медаль і Ганаровая грамата, а старшыням камісій садзейнічання Савецкаму фонду міру, якія прыклалі шмат намаганняў у арганізацыі збору сродкаў, — ганаровыя жэтоны. Узнагароду атрымалі старшыня камісіі пры вытворчым абутковым аб'яднанні «Прамень» З. Д. Гарачка і старшыня універсітэцкай камісіі, галоўны рэдактар выдавецтва БДУ У. А. Сарока.

І. ВАНЦЯНКОЎ.

# УРАЖАННЕ ДОБРАЕ

У той час як для большасці студэнтаў-завочнікаў сесія толькі пачынаецца, юрысты ўжо могуць падвесці некаторыя вынікі. І таму мы вырашылі пагутарыць з загадчыкам кафедры гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта дацэнтам І. А. Юхо.

— Іосіф Аляксандравіч, Вы былі экзаменатарам, раскажыце, калі ласка, аб сваіх уражаннях.

— У цэлым студэнты паказалі даволі глыбокія веды па курсу гісторыі дзяржавы і права БССР. Некаторыя напісалі вельмі добрыя курсавыя работы і на экзамене пацвердзілі сваю добрасумленную працу. Прыемна было слухаць студэнтаў III курса С. В. Гулевіч, Г. І. Чурыкава, А. В. Дунец.

Сярод другакурснікаў, якія экзаменаваліся па гісторыі дзяржавы і права СССР, выдатныя адзнакі атрымалі Н. А. Буцькова (яе адказ вызначаецца высокай культурай мовы, уменнем паслядоўна, лагічна стройна выкласці матэрыял), А. Е. Ерашэўскі, В. Д. Кармызаў. Добра падрыхтаваліся І. Г. Купцоў, Л. К. Пісарава і іншыя.

— Як на працягу семестра калектыў кафедры працаваў з завочнікамі?

— Перш за ўсё пастараліся, каб своечасова забяспечыць студэнтаў заданнямі, указальнікамі літаратуры. Праводзілі кансультацыі з тымі, хто звяртаўся за дапамогай. Прыязджалі да нас і студэнты з Барысава, Смалявіч, Рудзенска. Раіліся, якую лепш тэму ўзяць для курсавой работы, на якія літаратурныя крыніцы звярнуць больш увагі.

У гэтым годзе на кафедры была ўведзена новая практыка рэцэнзавання курсавых работ. Вырашылі адразу пасля праверкі не вяртаць студэнту яго работу, а высылаць толькі рэцэнзію. Калі студэнт прыязджае на сесію, яму ўручаецца яго курсавая, падрабязны разбор якой робіцца на семінарскіх занятках.

На наш погляд, такая сістэма дысцыплінуе студэнтаў, прымушае іх лепш, адказней адносіцца да самастойнай працы. Праўда, выкладчыку даводзіцца затрачваць крыху больш часу, але вынік варты таго.

І яшчэ. Хацелася б мне выказаць прапанову нашага калектыву. Некаторую складанасць выклікае тое, што на сесію адначасова прыязджае вельмі многа студэнтаў. Ці не лепей было б дэканату завочнага факультэта некалькі расцягнуць тэрмін сесіі? Тады больш раўнамерна можна размеркаваць нагрузку і апраўдана чакаць паглыблення ведаў студэнтаў.

# НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

**Нам ад 20 да 40, але мы студэнты. Мы ўжо 6 год студэнты-завочнікі. Многа цяжкасцей давялося адчуць за гэтыя гады, але, падыходзячы да фінішу, мы з жалем развітваемся з універсітэтам — нашым старэйшым таварышам, сябрам і настаўнікам. У падзяк словы аднолькавыя, але мы, студэнты VI курса аддзялення рускай мовы і літаратуры, сёння ўкладваем у іх цеплыню і пяшчоту 94 чалавечых сэрцаў. Мы сардэчна дзякуем прафесарска-выкладчыцкаму саставу нашага факультэта. На ўсё жыццё мы запомнім наш родны універсітэт, вас — не толькі таленавітых вучоных, але і цудоўных людзей. Вялікае дзякуй, дарагія старэйшыя таварышы, ад усіх студэнтаў нашага курса, ад усіх паклоннікаў вашых ведаў і працы!**

**Нельга не сказаць тых слоў падзякі і нашаму метадысту В. А. Калекан за клопаты пра нас і спагаду ў нашым лёсе.**

**Мы абяцаем роднаму універсітэту высока несці званне народнага настаўніка.**

**СТУДЭНТЫ VI КУРСА АДДЗЯЛЕННЯ РУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ.**







*НА ЗДЫМКАХ: шасцікурснікі біялагічнага факультэта на занятках вялікага спецпрактыкума па вышэйшых раслінах, якія праводзіць Н. К. КУДРАШОВА.*

Фота *Д. Чаховіча.*

# НАШЫ ПЕРШЫЯ ПАМОЧНІКІ

**Пачатак экзаменацыйнай сесіі у студэнтаў-завочнікаў 27 студзеня, але задоўга да гэтага дня людна і шумна было на завочным факультэце, які знаходзіцца зараз у геаграфічным корпусе. Прыходзілі мінчане, прыязджалі студэнты з бліжэйшых раёнаў, каб загадзя пазнаёміцца з раскладам заняткаў, экзаменаў і залікаў.**

**А расклады гэтыя рыхтуюцца загадзя, з тым, каб своечасова давесці іх да ведама кожнага выкладчыка, бо ў час сесіі лекцыі і кансультацыі асабліва каштоўныя і неабходныя студэнтам.**

**У першыя ж дні сесіі у дэканат завочнага факультэта прыходзяць старасты курсаў і груп. Яны атрымліваюць адпаведныя указанні, дакументацыю. Гэта першыя памочнікі метадыстаў, таму што без іх не можа быць зладжанай работы, моцнай сувязі паміж студэнтамі і дэканатам.**

**Старастам курсаў і груп прыходзіцца ў час сесіі спалучаць вучобу з немалой адміністрацыйнай работай, але, як правіла, гэта не адбіваецца на іх поспехах. Прыкладам тут могуць быць стараста II курса Аляксандра Мікалаеўна Латушкіна і стараста IV курса Тамара Мікалаеўна Пахутка, у залікоўках якіх толькі выдатныя і добрыя адзнакі. Абедзве працуюць настаўніцамі рускай мовы і літаратуры, а Т. Латушкіна ўжо мае 25-гадовы стаж.**

**Такіх старaст многа. Нам, метадыстам, хочацца сказаць ім вялікае дзякуй за работу і дапамогу.**

**В. КАЛЕКАН,**
**метадыст аддзялення рускай мовы і літаратуры.**

# У ДАПАМОГУ СТУДЭНТАМ

З верасня на завочным факультэце БДУ пачаў працаваць вучэбна-метадычны кабінет. У нас ён арганізаван упершыню, і цяжка было наладзіць работу так, каб была яна выгаднай для студэнтаў-завочнікаў і для выкладчыкаў. Давялося паехаць у Ленінградскі універсітэт для азнаямлення з работай метадычнага кабінета. Работа там арганізавана добра, ёсць амаль уся неабходная для студэнтаў-завочнікаў літаратура: усе праграмы, метадычныя дапаможнікі, указанні, кантрольныя заданні, якія складаюць самі выкладчыкі універсітэта. І студэнты поўнасцю забяспечваюцца неабходнымі кнігамі.

У нас на завочным факультэце вучыцца больш 4500 студэнтаў, і кожны з іх карыстаецца метадычнымі указаннямі, праграмамі, дапаможнікамі. Але не усе студэнты аддзяленняў маюць магчымасць атрымаць неабходную літаратуру. Так, напрыклад, для аддзялення філасофіі літаратура не паступала на працягу некалькіх год. У лепшым становішчы студэнты юрыдычнага аддзялення. ВЮЗІ амаль поўнасцю забяспечвае неабходнай літаратурай, якая выдаецца навучэнцам камплектамі, дзе знаходзяцца усе метадычныя ўказанні, праграмы, заданні да чарговай сесіі.

Паколькі некаторых дапаможнікаў не хапае, студэнты павінны, выкарыстаўшы іх, вяртаць у кабінет.

Я лічу, што арганізацыя метадычнага кабінета значна дапаможа студэнтам у вучобе: літаратура сабрана цяпер у адным месцы, лягчэй весці ўлік паступленняў з іншых вучэбна-метадычных кабінетаў, прадставілася больш магчымасцей задаволіць патрэбы завочнікаў.

**Т. АФАНАСЕНКА,**
**загадчык вучэбна-метадычнага кабінета.**

# ДАСЛЕДАВАННІ ВЯДЗЕ ЗАВОЧНІК

Штогод біялагічны факультэт заканчвае больш 70 завочнікаў. І, бадай, нельга пагадзіцца з думкай тых таварышаў, якія стаяць на пазіцыі, што завочна немагчыма атрымаць прадугледжаны праграмай аб'ём ведаў.

Як паказаў вопыт, большасць завочнікаў не толькі паспяваюць спраўляцца з вучэбным планам, але вядуць і навукова-даследчую работу. Вынікам яе, як правіла, з'яўляецца дыпломная. Так, напрыклад, у саставе цяперашняга шостага курса ёсць нямала сур'ёзных і удумлівых даследчыкаў, якія ўжо правялі цікавыя вопыты і атрымалі эксперыментальныя матэрыялы для напісання дыпломных работ. Да такіх студэнтаў, перш за ўсё, варта аднесці В. Д. Свірыда, які правёў вялікую, карпатлівую і вельмі патрэбную работу па асаблівасцях цвіцення і пладанашэння інтрадуцыраваных і мясцовых відаў клёна. Фрагменты з гэтай работы былі прадстаўлены на рэспубліканскі агляд студэнцкіх навукова-даследчых работ. Праца рэспубліканскай камісіяй аднесена да першай катэгорыі.

Сур'ёзныя даследаванні па ўплыву аргана-мінеральных угнаенняў на рост каштана конскага і дуба краснага правялі студэнты-завочнікі Г. В. Жалток, А. П. Зенчык і І. Н. Гарашкевіч. Работа вялася ў вопытнай гаспадарцы «Шчамысліца».

Варта адзначыць, што і ў мінулых выпусках большасць студэнтаў-завочнікаў зарэкамендавалі сябе як удумлівыя даследчыкі. Да ліку іх можна аднесці В. В. Сяргеева, які працаваў па фітафтарозу таматаў і напісаў цудоўную работу, якая была адзначана дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй. Цяпер В. В. Сяргееў працягвае працу ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце пладоў, агародніны і бульбы (БНДІПАБ). Заслугоўвае пахвалы і работа П. Е. Казак па эфектыўнасці гербіцыдаў у барацьбе з пустазеллем. П. Е. Казак цяпер працуе дырэктарам сярэдняй школы.

Даволі сур'ёзныя даследаванні правялі па лішайніках студэнты Е. П. Скакун і А. В. Клачко. У выніку яны напісалі выдатныя дыпломныя работы, якія таксама асоба адзначаліся ДЭК.

Прыемным з'яўляецца і тое, што многія выпускнікі-завочнікі, якія паспяхова закончылі наш факультэт, абаранілі кандыдацкія дысертацыі і цяпер працуюць у навукова-даследчых установах або у вну. Толькі з нашага выпуску кандыдатамі сталі Р. В. Куневіч (загадчык лабараторыі біялагічных метадаў барацьбы са шкоднікамі і хваробамі раслін у БНДІПАБ; С. І. Баброўскі (намеснік дырэктара па навуцы Ганусаўскай даследча-селекцыйнай станцыі па цукровых бураках); Ф. Ф. Кахманюк (старшы выкладчык Брэсцкага педагагічнага інстытута). Гэты спіс можна было б прадоўжыць. А колькі выпускнікоў працуюць у навукова-даследчых інстытутах, дырэктарамі сярэдніх навучальных устаноў — і усе яны атрымалі пуцёўку ў жыццё на нашым завочным факультэце.

У заключэнне хочацца выказаць думку, што завочная форма вучобы біялагічнага профілю цалкам апраўдвае сябе, і яе неабходна усямерна развіваць і падтрымліваць.

**А. ШУКАНАЎ,**
сакратар партбюро біяфака, выпускнік завочнага факультэта 1962 г.

ТЭАТР

# «З ВЕЧАРА ДА ПОЎДНЯ»

КОЖНАЯ новая пастаноука выклікае пытанне: чаму тэатр узяу гэтую тэму, якую праблему ён хоча паставіць? Даволі зразумелая зацікауленасць рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага да аднаго з цікавейшых савецкіх драматургау, чыя творчасць накіравана на сцвярджэнне высокіх маральных ідэалау.

Новая п'еса В. Розава—аб душэунай шчодрасці, аб вялікай пераутвараючай сіле чалавечнасці. З героямі мы сустракаемся у крытычныя моманты іх жыцця. Творчы крызіс перажывае пісьменнік Андрэй Жаркоу. Іменна «з вечара да поудня» ён зразумеу, што як пісьменнік ён ужо не можа нічога даць. Перад цяжкай праблемай стаць Кім Жаркоу. Ці зможа ён перамагчы свой бацькоускі эгаізм і аддаць сына сваёй былой жонцы? Нарэшце, у доме канаучага ансамбля. У нашым спектаклі такое адзінства нярэдка парушаецца, некаторыя сцэны (напрыклад, Лёвы Груздзева і Ніны) меладраматычныя, што, вядома, паніжае адзінае гучанне спектакля. Хацелася б бачыць больш дакладнае сцэнічнае рашэнне ключавых сцэн, такіх, як сцэна Кіма, яго жонкі, Андрэя Трафімавіча, Альберта. Тут дынаміка падмяняецца мітуснёй. Не лепшым чынам вырашан і фінал, дзе за знешняй напружанасцю знікае сэнс фінальных слоу Кіма. Магчыма, такія рэжысёрскія пралікі перашкодзілі стварэнню поунага акцёрскага ансамбля. Часам канфлікты «груп» іграюцца самі па сабе, ніяк не аб'яднаныя асноунай задумай п'есы.

Агульныя памылкі рэжысёрскага рашэння спектакля далі адчуць сябе у нейз'яуляецца Лёва Груздзеу, чалавек, які прынёс шмат пакут Ніне Жарковай.

Бадай, асноуная заслуга драматурга у тым, што ён здолеу паказаць, як гэтыя людзі не толькі не сагнуліся пад цяжарам сваіх асабістых бед, але выйшлі з іх яшчэ больш моцнымі і цудоунымі. І галоунай сілай, якая дапамагла ім перамагчы няшчасці, стала вялікая душэуная шчодрасць.

Дынамічнасць дзеяння, насычанасць падзеямі, канфліктамі вылучыла перад пастаноушчыкам спектакля А. Д Смеляковым цяжкую задачу. Трэба было «не заблудзіцца» у гэтай масе падзей, трэба было так пабудаваць спектакль, каб за сюжэтным ходам не гублялася асноуная ідэя. І калі увогуле гэту задачу удалося вырашыць, дык яшчэ больш крыудна за некаторыя пралікі у пастаноуцы.

Галоуны, на наш погляд, заключаецца у адсутнасці жанравай акрэсленасці спектакля. А яна ж дае магчымасць прад'явіць адзіныя патрабаванні да усяго выкай меры і на выканауцах. Не зусім, на наш погляд, задавальняе рашэнне вобраза Андрэя Трафімавіча Жаркова у выкананні Карсакоускага. Яго Жаркоу часам залішне рэзанёрствуе, унутраная напружанасць падмяняецца крыкам, што збядняе вобраз. Хацелася б бачыць і больш выразна акрэсленую лінію унутранага развіцця героя. Тэкставы матэрыял давау магчымасць выканауцу паказаць глыбокі, моцны характар чалавека здольнага, пісьменніка, які умее пераадолець сваё самалюбства дзеля высокай адказнасці мастака.

Цікавая у спектаклі работа народнага артыста БССР Р. Н. Янкоускага. Артысту удалося стварыць пераканаучы вобраз чалавека шчодрага, любячага, эмацыянальнага і чуткага.

Вялікае задавальненне прыносіць ігра народнай артысткі СССР А. І. Клімавай. Актрыса яшчэ раз паказала, што валодае «вышэйшай матэматыкай» акцёрскага майстэрства. Клімава стварае складаны, шматпланавы характар жанчыны разумнай, стрыманай і кахаючай, чуткай маці. Прычым і знешні і унутраны планы акрэсліваюцца тонка і шчыра.

Хочацца сказаць добрае слова і у адрас выканауцы ролі Ягор'ева — артыста Шрамчанкі. Захапляе шчырасць і тактоунасць гэтага акцёра. Скупа, дакладна і тонка ім створан цікавы характар.

Цяжкая задача выпала на долю артысткі Аучыннікавай. Складана іграць ролю чалавека фізічна хворага, з вялікай душэунай траумай, надзеленага адным з каштоунейшых талентау— уменнем глыбока і самааддана любіць. У такіх ролях заусёды ёсць небяспека быць слязлівым, паддацца жаданню выклікаць да сваёй гераіні жаль, а не спачуванне. На гонар Аучыннікавай, яе Ніна мужная дзяучына. Ролю актрыса праводзіць стрымана і з дастатковым тактам. Прауда, у начной сцэне з Груздзевым гэтая стрыманасць здраджвае актрысе.

Добра выглядае у ролі Альберта малады акцёр Галуза. Ён іграе пераканауча, з густам, хоць і адчуваецца недахоп тэхнічнага вопыту, асабліва у эмацыянальных сцэнах.

На жаль, збедненым атрымауся вобраз Лёвы Груздзева (заслужаны артыст Грузінскай ССР Б. М. Казінец). Характар, на думку аутара, складаны і своеасаблівы, паустау бледным і прамалінейным. Наурад ці можна згадзіцца з акцёрам, які трактуе Груздзева як недалёкага эгаіста. І цяжка апраудаць у такім выпадку любоу да гэтага чалавека Ніны. Было б цікавей, калі б акцёр паказау свайго героя чалавекам здольным, які глыбока памыляецца у пытаннях чалавечых узаемаадносін, а не прапісным цынікам.

І усё ж, нягледзячы на некаторыя рэжысёрскія агрэхі, спектакль атрымауся цікавы вастрынёй пастауленых праблем, сваёй гуманістычнай накіраванасцю.

**О. КУКРАК,**
**аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.**



Каб быу цікавым урок па фізіцы, трэба пастарацца і лабаранту.
*НА ЗДЫМКУ: Уладзімір ГАРУНОВІЧ, студэнт I курса вячэрняга аддзялення фізічнага факультэта БДУ, лабарант Мінскай школы № 79, рыхтуе прыборы для дэманстрацыі.* Фота Г. Марозава.

# ПАЕЗДКА Ў МУЗЕЙ

Многа розных музеяу у Мінску, але заалагічны універсітэта — асаблівы. Тут можна пазнаёміцца з жывёльным светам Беларусі, краіны, планеты.

Мы з дзевяцікласнікамі вельмі хацелі пабываць у гэтым музеі. Спачатку напісалі туды пісьмо. Загадчык музея Барыс Яугеньевіч Нартыш-Блук прыслау адказ. Ён сардэчна запрасіу нас прыехаць, паведаміу, у якія дні гэта лепш зрабіць.

І вось мы у музеі. Перад намі тысячы экспанатаў, вочы разбягаюцца. Ды і экспанаты мауклівыя, яны нічога не могуць сказаць самі аб сабе. Але нам на дапамогу прыйшоу Алег Канстанцінавіч Фядосау. Ён правёу вельмі цікавую экскурсію. З яго расказа рабяты узялі столькі цікавых звестак, колькі не знойдзеш ні у адной кнізе і не пачуеш ні на адным школьным уроку па заалогіі.

Ад імя усіх удзельнікау экскурсіі хацелася б праз газету «Беларускі універсітэт» сардэчна падзякаваць Б. Я. Нартыш-Блуку і А. К. Фядосаву за вялікую увагу да школьнікаў, а музею пажадаць далейшага росквіту.

**В. АРЛОУ,**
**класны кіраўнік 9-га класа Мар'інагорскай сярэдняй школы № 3.**

# НАВІНКІ БІБЛІЯТЭКІ БДУ

✦ Гаурылкін Л. «Пакінутая на досвітку». Аповесці. Мінск. «Беларусь». 1970.

✦ Федоров Р. П. «Анонимная власть. Классовые организации монополистического капитала в ФРГ». М. «Международные отношения», 1970.

✦ Шовен, Реми. «Мир насекомых». Пер. с франц. Н. Б. Кобриной. Под ред. и с предисл. И. А. Халифмана. М. «Мир», 1970.

✦ День поэзии. Год тысяча девятьсот семидесятый. (Сборник). Л. («Сов. писатель», Ленингр. отд-ние, 1970).

✦ Арабей Л. Л. «Костры метели». Повести. Авториз. пер. с белорус. В. Щедриной. М. «Сов. писатель», 1970.

✦ Луначарский А. В. «За право на счастье». Дневники. Письма. Повести. (Послесл. Л. Пинчук. Илл. Н. Романова. М. «Мол. гвардия», 1970.

✦ Проверено на себе. Документы, дневники, воспоминания о Герое Советского Союза, заслуженном летчике - испытателе СССР Юрии Гарнаеве, отдавшем авиации тридцать лет своей яркой жизни, освоившем 120 типов летательных аппаратов, авторе очерков и стихов.

✦ СССР и союзные республики в 1969 году. (Сообщ. ЦСУ СССР и ЦСУ союзных республик об итогах выполнения гос. плана развития нар. хоз-ва). (Сборник). М. «Статистика», 1970.

✦ ООН: Итоги, тенденции, перспективы. (К 25-летию ООН). Предисловие Н. Н. Иноземцева. М. «Международные отношения», 1970.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.



У САСНОВЫМ БАРЫ. Фотаэцюд Г. Марозава.

# МАЗАІКА

*КРЫНІЦЫ ШУМУ*

Анкета, праведзёная у Галівудзе, паказала, што існуе шэсць відаў гукау, якія выклікаюць у людзей найвышэйшае нервовае раздражненне. Вось яны: сірэна (сігнал трывогі), трэск палаючага лесу, эха аддаленага галопу каня, выццё сабакі, крык жанчыны, а таксама... вясельны марш.

*АПОШНІ — ЧАЛАВЕК*

Заолагі ЗША склалі спіс жывых істот па ступені ўважлівасці, якую яны праяуляюць пры пераходзе вуліцы. На першым месцы аказалася гусь. Яна амаль ніколі не трапляе пад калёсы. Затым ідуць свіння і кошка. Сабака і курыца падзялілі чацвёртае месца. Апошнім быу чалавек.

*ВЫ ДРЭННА ЧУЕЦЕ? НЕ СПЯВАЙЦЕ*

Рэзкае пагаршэнне слыху, падобнае на акустычную траўму, было выяўлена ўрачамі ў большасці лірычных спевакоў. І не дзіуна — узровень іх гукаў складае ад 100 да 200 дэцыбел.

# Вясёлыя дыялогі

*ВЫКЛАДЧЫК: Няужо вы, скупа ахарактарызавaушы «Вішнёвы сад», так мала можаце расказаць і аб самім аутару?*

*СТУДЭНТ: Чэхаву належаць словы: «Кароткасць—сястра таленту».*

***

*ПРАФЕСАР: Перш чым прыступім да экзамена, скажыце, ці ёсць у вас да мяне якія-небудзь пытанні?*

*СТУДЭНТ: А па якому прадмету экзамен?*

***

*ВЫКЛАДЧЫК: Чаму вы спазніліся на экзамен, Клімава?*

*СТУДЭНТКА: Мяне муж не пускаў.*

*ВЫКЛАДЧЫК: Дык вы што, па дамастрою жывяце?*

*СТУДЭНТКА: Не, па Пушкінскай.*

***

*Хімік у аптэцы:*

*— Мне патрэбна саліцылавая кіслата або борная, або ацэдумсаліцылавая...*

*— Вы, можа, хочаце сказаць, што вам патрэбен аспірын?*

*— Так-так, я заусёды забываю дакладную назву.*

***

*Аднаго разу у кабінет акадэміка М. М. Бекетава убег усхваляваны чалавек і закрычау:*

*— Мікалай Мікалаевіч, у вашай бібліятэцы зладзеі!*

*— І што ж яны там чытаюць?*

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны ко п с, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Др карня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2000 экз. АТ 08053. Зак. № 129.